# Рагуля для Мікалая Іванавіча

**Напярэдадні Дня Перамогі ветэран Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Габрыновіч атрымаў ад райвыканкама і СУП «Хажоваагра-2009» вельмі жаданы падарунак – сертыфікат на... карову.**

— Мы з жонкай Мiроніяй Фёдараўнай у вёсцы выраслі, прывыклі на зямлі працаваць і ўсё сваё меццы, — расказвае Мікалай Іванавіч, працаўнік прыфрантавой зоны, які аднаўляў разбураную чыгунку. — У 1960-я гады купілі зруб, адбудавалі дом і ўсё жыццё трымалі вялікую гаспадарку. На нашых Лясных раней у статку больш за 70 кароў было, пасвілі іх пад Цівідаўкай, там калгас зямлю выдзеліў. Нядаўна мы сваю старую карову здалі, і так нам нязвыкла, проста невыносна без яе жыць. Думалі-думалі — і вырашылі звярнуцца ў райвыканкам з просьбай дапамагчы нам набыць новую карову.

— У раённым выканаўчым камітэце разгледзелі заяву Мікалая Іванавіча і вырашылі да Дня Перамогі зрабіць яму падарунак сумесна з СУП «Хажоваагра-2009», — сказаў першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні райвыканкама Аляксей Раманюк, які ўручыў ветэрану сертыфікат на бясплатнае атрыманне каровы.

— У любы зручны час Мікалай Іванавіч і Міронія Фёдараўна могуць прыехаць да нас і выбраць карову, — падхапіў эстафету святочнага віншавання дырэктар СУП «Хажоваагра-2009» Сяргей Шаблоўскі.

Ён адзначыў, што сям'я Габрыновічаў вельмі працавітая і гаспадарлівая, на працягу многіх гадоў пастаянна здавала ў гаспадарку цялят і, можна сказаць, заслужыла такі падарунак.

Па словах дырэктара, карова цяпер каштуе ад 2 тысяч рублёў.

Ды хіба вымераеш грашыма велізарны ўклад Мікалая Іванавіча ў набліжэнне Перамогі! Рабоце на чыгунцы ён аддаў 45 гадоў жыцця. Прыйшоў сюды рабочым у 17-гадовым узросце. Расказвае, што асабліва цяжка было ў ліпені 1944-га, калі за станцыю Маладзечна ішлі жорсткія баі.

— Чацвёра сутак мы не спалі, аднаўлялі ўшчэнт разбомблены фашыстамі пуць, каб па ім маглі ісці нашы эшалоны. Фашысты бамбілі, на рэйках былі закладзены міны запаволенага дзеяння, — успамінае дні вызвалення ветэран. – Ніхто з нас тады не думаў ні пра сон, ні пра ежу, стараліся з усіх сіл, каб наладзіць работу чыгункі, разумелі яе стратэгічнае значэнне.

Сёлета паважанаму ветэрану спаўняецца 95 гадоў. Яго жонка на 11 гадоў маладзейшая, разам яны ўжо 64 гады. У Маладзечне жыве з сям'ёй іх сын Віктар. Малодшы Леў, на вялікі жаль, два гады таму заўчасна пайшоў з жыцця. У Габрыновічаў чацвёра ўнукаў, пяцёра праўнукаў. Аднаго з унукаў у гонар дзеда назвалі Мікалаем.

Напярэдадні Дня Перамогі да ветэрана з віншаваннямі і падарункамі завіталі таксама прадстаўнікі Маладзечанскай раённай арганізацыі «Белая Русь» на чале з яе старшынёй Марынай Шчыгло. Цэлая дэлегацыя прыйшла і ад станцыі Маладзечна: намеснік начальніка станцыі чыгуначнай па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях Юлія Паплёўка, старшыня прафсаюзнай арганізацыі Святлана Зубрыцкая, старшыня ветэранскай арганізацыі Наталля Дземідовіч. Кветкі, падарункі, торт са святочнай сімволікай – усё рыхтавалі з душой, з вялікім жаданнем зрабіць прыемнае паважанаму чалавеку. А выкладчыкі гімназіі-каледжа мастацтваў Ірына Стасевіч, Аляксандр Розін, Яўгеній Бурачонак суправаджалі віншаванні любімымі ваеннымі песнямі.

— Родныя нашы! Дзякую, што памятаеце! – сказаў на развітанне расчулены ветэран.



**Першы намеснік старшыні райвыканкама Аляксей Раманюк уручыў сертыфікат Мікалаю Габрыновічу.**

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: Віталій КРУПЯНЬКОЎ.**